Салігорск• Слуцк• Наваполацк• Гродна• Мазыр• Бабруйск• Магілёў• Гомель

У адзінстве наша сіла!



САЛІДАРНАСЦЬ

№ 39 (398)

10 - 16 снежня 2001 года

Цана свабодная
Для сябраў БНП - бясплатна

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА ГАРНЯКОЎ, ХІМІКАЎ, НАФТАПЕРАПРАЦОЎШЧЫКАЎ, ЭНЕРГЕТЫКАЎ, ТРАНСПАРТНІКАЎ, БУДАЎНІКОЎ І ІНШЫХ РАБОТНІКАЎ

Личное мнение

ХОТЯТ ЛИ БЕЛАРУСЫ СПОКОЙНОЙ ЖИЗНИ?

8 декабря исполнилось десять лет подписанию Беловежских соглашений, юридически оформивших распад СССР. Эта дата широко освещалась государственными средствами массовой информации, в отличие от прошедшего практически незамеченным еще одного юбилея – десятилетия объявления независимости Беларуси (не путать с принятием Акта «О государственном суверенитете БССР»). Да и могло ли быть иначе?..

Годовщине Беловежских соглашений предшествовал юбилейный саммит глав государств – членов СНГ, состоявшийся в Москве. В нем участвовал и «дважды всенародно избранный» президентом Беларуси А. Лукашенко. Его визиту в Москву – первой зарубежной поездке после состоявшихся выборов – придавалось большое значение. Во-первых, Россия – единственная крупная более-менее демократическая держава мира, признавшая президентство «батьки». Во-вторых, она, до недавнего времени, чрезвычайно щедрый спонсор Беларуси. Ну, а в-третьих, один из международных гарантов независимости нашей страны. Правда, об этом последнем обстоятельстве не принято сейчас вспоминать: как-никак на горизонте маячит фантом Союзного государства России и Белоруссии (сокращенно будет Россируссия – удачный неологизм, придуманный командой КВН БГУ). Вот и поехал в белокаменную Григорьевич не с пустыми руками. Вместо торта, цветов и открытки, российский «папа» получил куда более приятный подарок: закрытие газеты с таким ненавистным великодержавному уху названием «Пагоня» и ликвидацию общественного объединения «Згуртаванне беларускіх студэнтаў». Впрочем, вряд ли В. Путин даже подозревал о существовании этой газеты и этого объединения. Важен сам факт закрытия – своеобразный «сигнал зеленой ракетой» кремлевским государственникам: мол, к зачистке союзной республики от националистов – готов!

Любить свою Родину, свой народ и свой язык – значит, быть патриотом. Так вам ответит любой россиянин. У нас же за подобные чувства добропорядочные и законопослушные граждане получают оскорбительные ярлыки «националист» и «отморозок». Такова позиция не только официального Минска в отношении своих граждан, но и официальной Москвы в отношении граждан Беларуси, Украины, стран Балтии, Грузии и т.д.

(Окончание на 2-й стр.)

ДЭКЛАРАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА – 53 ГАДЫ

10 снежня споўнілася 53 гады з часу прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Генеральная асамблея Арганізацыі Аб'яднаных нацый, прыняўшы тэкст Дэкларацыі, звярнулася да дзяржаў-падпісантаў з заклікам зрабіць усё магчымае для яе распаўсюджання і растлумачэння. І праз 53 гады ў Беларусі не выконваецца большасць артыкулаў Дэкларацыі. Да прыкладу, права на жыццё, волю і асабістую недатыкальнасць, права на свабоду перамяшчэння і абранне месца пражывання, права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі і г.д.

Да дня гадавіны прыняцця Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека ў Мінску адчыніцца выстава «Не дазволена цэнзурай». Экспазіцыю складуць творы апошніх 10 год, забароненыя цэнзурай. Пад кожным экспанатам мае быць пазнака: які чыноўнік і з якіх матываў перакрыў яму дарогу да спажыўца. Выстава падрыхтавана мастаком Алесем Пушкіным.

Адным абзацам

- **Официальный Минск присоединился к международной траурной акции памяти жертв террористических актов 11 сентября, которая проводилась в мире по инициативе президента США Джорджа Буша. 11 декабря в 15.46 на первом национальном телеканале Беларуси и по госрадио была объявлена минута молчания в память о жертвах терактов.**
- Десятого декабря зарубежное предприятие «Рестораны «Макдональдс» отметило своеобразный юбилей - пятилетие своего присутствия в Беларуси, точнее, пока только в столице. Ежедневно «Макдональдс» посещают около 20 тысяч минчан.
- **В Гродно планируется создание свободной экономической зоны. Согласно проекту, на ее территории будут размещаться предприятия, ориентированные на выпуск продукции на экспорт, а также предприятия, которые будут выпускать импортозаменяющую продукцию для беларусских потребителей. Резидентами будущей свободной экономической зоны «Гродно-Инвест» изъявили желание стать около 30 предприятий Польши, Литвы и Германии.**
- В Беларуси появилось новое периодическое издание - «Театральная газета». Своей главной задачей ее сотрудники считают популяризацию талантливых людей, которые посвятили свою жизнь театральному искусству. Редактор издания - Светлана Бартохова, поэтесса и режиссер. Приобрести «Театральную газету» можно в театрах, на концертных площадках Минска, а также через подписку.
- **В Минске открылась выставка «Тростенец - 60 лет трагедии», которая работает в помещении Духовного театра костела Святых Сымона и Алены. В экспозиции представлены фотоснимки места трагедии, сделанные сразу после отступления фашистов, а также в наши дни, снимки жертв лагеря и чудом уцелевших узников, картины современных минских художников на военную тему. В отличие от Хатыни, на месте трагедии до сих пор нет мемориала. Вплотную к территории бывшего лагеря смерти примыкают промышленная зона и микрорайон Шабаны, да еще городская свалка.**
- В течение 2001-2002 г.г. будет проведена реконструкция всех рынков столицы с приведением их в цивилизованный вид по образцу Комаровского рынка и в соответствие с архитектурой города. По словам председателя Мингорисполкома М. Павлова, рабочие места сокращаться и сноситься не будут. Но возможно перенесение павильонов. Будут созданы дополнительные места для парковки.
- **Согласно приказу министра внутренних дел Беларуси, со следующего года на службу в милицию не будут набираться «люди с улицы». Таким образом министр ненавязчиво объяснил народу, кто сегодня стоит на страже общественного порядка. По словам начальника ГУВД беларусской столицы Александра Рака, существовавшая ранее практика кадрового отбора «себя полностью изжила», поскольку «к нижнему звену милицейской службы возникает много вопросов».**

Прогноз погоды

Солигорск, Слуцк	Пятница 14.12	Суббота 15.12	Воскр. 16.12
	снег, метель	снег, метель	возможен снег
День:	- 5	- 6	- 4
Ночь:	- 10	- 8	- 7

YAHOO! Weather

Памёр наш калега Мікалай ХУДАЕШКА, рэдактар газеты «Новый Лукомль» – чалавек шчыры і адданы працы. Праўленне Беларускай асацыяцыі журналістаў глыбока смуткуе з прычыны яго заўчаснай смерці і выказвае спачуванні сям'і нябожчыка.

ХОТЯТ ЛИ БЕЛАРУСЫ СПОКОЙНОЙ ЖИЗНИ?

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Вот только почему-то Москва не спешит придать статус второго государственного на территории России татарскому языку, хоть у русских и татар многовековая общая история, переплелись культурные традиции, да и матерный русский язык, на котором говорит большинство населения, «подарила» Казань. Зато в Беларуси вот уже скоро как семь лет имеются два государственных языка.

Что изменилось к лучшему за эти годы? Стали меньше гороха добавлять в вареную колбасу? Нет. За семь лет реальная зарплата возросла в семь раз? Нет. Облегчилась жизнь чиновников? Да. Впрочем, они и так никогда особо себя не утруждали – положение в экономике служит ярким тому доказательством. Именно они «взвыли», не желая учить государственный беларусский язык, напрягать для этого извилины. Особенно, когда нечего напрягать... Единственным разумным объяснением этой возни со сменой языков, гербов, флагов может служить создание хорошей мины при плохой игре под названием «Передел политической карты Европы». Просто у России уже не те зубы, чтобы за одну ночь оттяпать целое независимое государство, как в свое время проделывал дедушка Сталин. Вот и приходится создавать видимость «добровольного» вхождения Беларуси в состав России: мол, один язык – один народ. Международное общественное мнение подготавливает к «аншлюсу» В. Путин. И надо отдать ему должное – успешно. Германия – уже давно не против. Канцлер Шрёдер не посрамит прах другого канцлера – великого «закройщика» карты Европы Адольфа Гитлера. Соединенные Штаты, вроде, тоже согласны. Во всяком случае, Госдеп США заявил о том, что разорвет дипломатические отношения с Беларусью в случае создания Союзного государства. А это России и надо, ведь дипотношения со Штатами у нее останутся.

Проект Конституционного акта Союзного государства, пардон, Россирусии предусматривает создание общего парламента из 103-х мест, в котором беларусам будет принадлежать лишь 28. Депутаты от России смогут сделать с нашей маленькой европейской страной все, что заблагорассудится, вплоть до назначения нового губернатора края вместо горячо любимого Григорьевича – и прощай, синеокая, навеки. А чтобы никто «не вякал», мудрые мужи предусмотрительно включили в Проект статью 17, согласно которой политические партии и общественные объединения, выступающие против Союзного государства, будут распущены. Вспомните ныне существующий законодательный запрет беларусских властей упоминать в СМИ незарегистрированные партии и общественные организации – голос недовольных мировая общественность просто не услышит. Однако эти нововведения, ловко вставленные в Проект российскими интеграторами, станут для А. Лукашенко граблями, удар которых уже не просто разобьет лоб... Мечта демократов о Беларуси без Лукашенко может осуществиться таким неожиданным образом.

Россия требует от А. Лукашенко подогнать наши законы под российские. Иначе, мол, экономической интеграции не будет. Безусловно, наша восточная соседка ушла далеко вперед в плане экономических преобразований. Однако ей нужны не наши пенсионеры, учителя, врачи и, тем более, работники учреждений культуры, как и сама беларусская культура. Не введения 13-процентного подоходного налога для солигорских шахтеров хочет добиться Россия своими интеграционными потугами. Ей нужны наши леса и поля, реки и озера, недра и промышленные предприятия, железные и автомобильные дороги.

А нужен ли нам российский криминал, партии Баркашова, Жириновского и Лимонова? Нужна ли нам «общая» Чечня? Нужны ли базы ядерного оружия? Нужны ли нам перестрелки на территориях промышленных предприятий во время «разборок» конкурирующих мафиозных групп? Нужны ли убийства чиновников в подъездах их собственных домов и подрывы милицейских машин на фугасах? А ведь именно это получат жители Беларуси, независимо от национальности, вероисповедования и партийной принадлежности как граждане единой страны от Бреста до Курил – Россирусии.

Дмитрий АБРАМЫЧЕВ.

Рэпрэсіі

"НЯЗРУЧНЫЯ" ПЫТАННІ ДОРАГА АБЫХОДЗЯЦЦА...

У Барысаве на заводзе "Аўтагідраўзмацняльнік" распачаўся ўціск на супрацоўнікаў службы кантролю вымяральных прыбораў і аўтаматыкі – рабочага Ігара Закрэўскага і інжынера Анатоля Васілёнка. Мэта – прымусіць звольніцца гэтых людзей, якія раней не былі заўважаны ні ў кепскім выкананні прафесійных абавязкаў, ні ў парушэнні працоўнай дысцыпліны. У чым жа справа?

21 жніўня ў Барысаў прыязджаў Аляксандр Лукашэнка напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. У той дзень ён завітаў і на "Аўтагідраўзмацняльнік", каб сустрэцца з электаратам. Падчас гэтай сустрэчы Анатоль Васілёнак нагадаў кандыдату на прэзідэнта краіны пра тое, што Аляксандр Лукашэнка ў ходзе перадвыбарных выступленняў яшчэ летам 1994 года паабяцаў электарату: маўляў, ён сыйдзе з "заваяванага" крэсла ў выпадку няўдач з наладжваннем спраў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы – эканоміцы ў цэлым.

Паколькі становішча, паводле меркавання інжынера, застаецца крытычным, то ці не думае Аляксандр Рыгоравіч зараз зняць сваю кандыдатуру з прэзідэнцкай гонкі? А. Лукашэнка ўсміхнуўся і сказаў, што, папершае, ён гэткага абяцання ў сваю праграму тады не запісваў. Па-другое, ён услых запрапанаваў свайму атачэнню даручыць Анатолю Васілёнку ўзначаліць завод, цэх або ўчастак, а потым пагледзець, што ў яго атрымаецца з аздараўленнем гэтых сціплых структурных падраздзяленняў прамысловасці.

Ігару Закрэўскаму таксама пашанцавала задаць свае пытанні А. Лукашэнку. Адно з іх, якое тычылася праблемы абнаўлення ў дзяржаўных мас-медыя розных палітычных меркаванняў і прадастаўлення газетных старонак і тэлерадыёэфіру апазіцыі, засталося без адказу.

Адказ Ігару Закрэўскаму даў яго непасрэдны начальнік спадар Шэрсцень. Ён заявіў маладому чалавеку, што дае яму месяц для ўладкавання на працы ў іншым месцы. А потым, калі мінуў гэты тэрмін, але Ігар застаецца працаваць на заводзе, яго проста перавялі ў іншае месца ўнутры прадпрыемства. Шэрсцень пры гэтым паабяцаў, што будзе хлопцу кожнай раніцай даваць уласныя вытворчыя заданні на змену. Заадно ўпершыню за некалькі апошніх год дырэкцыя пазбавіла Закрэўскага прэміяльных на Дзень машынабудаўніка.

Такім жа чынам на заводзе абышліся і з інжынерам Анатолем Васілёнкам: пагрозы звальненнем, перавод на іншае месца працы ўнутры прадпрыемства, дэпрэміяванне.

Але тут "узбунтавалася" брыгада, з якой пастаянна працаваў А. Васілёнак. Яна "скінулася" з уласных сродкаў на прэмію Васілёнку. І – напісала ліст у "Советскую Белоруссию".

Цікава, што да гэтага часу суполка заводская Свабоднага прафсаюза на згаданыя рэпрэсіі ніяк не адрэагавала.

Алесь МІКАЛАЙЧАНКА.
Радыё Свабода.

RR РАДЫЁ РАЦЫЯ

10 - 11 снежня

З прычыны пагаршэння эканамічнага становішча прадпрыемства на вытворчым аб'яднанні «Палімір» прыпынена выкананне сацыяльна значных пунктаў калектыўнай працоўнай дамовы. Паводле стану на 1 лістапада дэфіцыт фонду спажывання, з якога фінансаваліся выдаткі на розныя ільготы працаўнікам, перавысіў 1 млрд. рублёў. У ліку адмененых гарантый - прадастаўленне 7-дзённага аплачваемага адпачынку, выплата матэрыяльнай дапамогі на аздараўленне, набыццё лекаў і навучанне. Адміністрацыя прадпрыемства абяцае, што адмененыя пункты калектыўнай працоўнай дамовы пачнуць дзейнічаць пасля 1 лютага наступнага года.

X X X

На Беларусі плануецца зачыніць палову малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў. Гэта прадугледжвае праграма аптымізацыі колькасці прадпрыемстваў мяса-малочнай прамысловасці, прапанаваная Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання. Колькасць мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў плануецца скараціць на 20%. Усе гэтыя скарачэнні Міністэрства тлумачыць малой загружанасцю прадпрыемстваў, што робіць высокім сабекошт перапрацаванай сельгаспрадукцыі.

X X X

А. Лукашэнка распарадзіўся праводзіць рэвізію фінансава-гаспадарчага стану суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці не часцей за адзін раз у год. Тым самым - падкрэслена ў каментарыі Адміністрацыі прэзідэнта - лідэр краіны выконвае свае перадвыбарчыя абяцанні ў частцы лібералізацыі эканомікі. Разам з тым, гэтым жа Указам дадзены дазвол на правядзенне пазапланавых праверак. Ініцыятарамі іх могуць выступаць сам прэзідэнт, Савет міністраў, Камітэт дзяржкантролю, Савет па каардынацыі кантрольнай дзейнасці, а таксама падатковыя, праваахоўныя і судовыя органы.

X X X

У канкурэнцыі нават хлеб, выбараны ў Беларусі, уступае расійскаму. Больш за 15 тон хлеба штодня прадаюць прадпрымальнікі і чаўнакі на рынках Гомеля. Расійскі хлеб карыстаецца попытам з прычыны лепшай якасці і ніжэйшых коштаў. Калі раней крамы абласнога цэнтра прадавалі штодня 120-130 тон хлеба, то цяпер з цяжкасцю збываюць 90 тон. Гэткае становішча склалася, дзякуючы ўвазе праваахоўных органаў да кіраўніцтва аб'яднання «Гомельхлебпрам», высокія чыны якога звінавачаны за хабарніцтва і продаж прадукцыі па завышаных коштах. Новае кіраўніцтва так і не здолела наладзіць выпуск якаснай і таннай прадукцыі.

Медицина

ПЕЧАЛЬНАЯ СТАТИСТИКА

Ежегодно в Беларуси умирает около 5000 человек, больных сахарным диабетом. Всего в республике на учете состоят 130 тысяч диабетиков и наблюдается рост заболеваемости. Причины, по мнению медиков, прежде всего кроются в неблагополучной экологической ситуации и во влиянии последствий чернобыльской катастрофы. К сожалению, болезнь «молодеет» - увеличивается количество молодых людей, которые страдают диабетом.

Кроме того, каждый год в республике умирает около 6000 человек от болезней дыхательной системы. По количеству смертей эти заболевания находятся на четвертом месте после сердечно-сосудистых, онкологических и травм. Основными причинами заболевания и смерти являются табакокурение, неблагоприятные экологические условия и генетическая предрасположенность организма.

По материалам печати.

Памяць

ПОМНІК ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ.

Не ў Зэльве, а ў Старых Дарогах

9 снежня на сядзібе прыватнага музея беларускага выяўленчага мастацтва, які яшчэ называецца Музеем Фонда Анатоля Белага, адбылося адкрыццё помніка слыннай нацыянальнай паэтэсе Ларысе Геніюш работы скульптара Міхася Інькова.

Адкрыццё помніка адбывалася ў прысутнасці шырокай творчай грамадскасці, прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі, навукоўцаў і супрацоўнікаў амбасадаў некаторых краін у Беларусі.

Цікава, што гэта ўрачыстасць супала з дзвюма датамі – 110-годдзем Максіма Багдановіча і 45-мі ўгодкамі вяртання Ларысы Геніюш з поўначы Расіі, дзе яна разам са сваім мужам адбывала тэрмін у сталінскіх лагерах.

Вось як ахарактарызавала такое супадзенне Вольга Іпатава, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў, сябра Камітэта па ўвекавечванні памяці Ларысы Геніюш:

- Пакручасты лёс творчасці Максіма Багдановіча і Ларысы Геніюш (а ў рэпрасаванай Ларысы Геніюш асабліва нялегкі жыццёвы шлях) сведчыць, як складана было працаваць творцам беларускага слова – нацыянальным паэтам і пісьменнікам у часы каланіяльнага царскага рэжыму і ў эпоху бальшавіцкага дыктату. Але ж імёны Максіма Багдановіча і Ларысы Геніюш заклікаюць нас, творцаў, змагацца за роднае слова, родную культуру...

Помнік Ларысе Геніюш паўстаў на музейнай сядзібе ў Старых Дарогах побач з помнікамі Максіму Багдановічу, яго бацьку Адаму Багдановічу, паэтуэмігранту Анатолю Бярозку. Гэтыя творы выяўленчага мастацтва тут з'явіліся сёлетнім летам.

Чаму помнік Ларысе Геніюш упершыню ў гісторыі беларускай культуры з'явіўся менавіта ў Старых Дарогах, а не на радзіме паэтэсы – у Зэльве?

Як падкрэслілі падчас адкрыцця помніка сам скульптар Міхась Інькоў і заснавальнік музея Анатоль Белы, гэта адбылося з-за неканструктыўнай пазіцыі ўраду РБ, які не дазволіў усталяваць твор Міхася Інькова на Савецкай вуліцы ў Зэльве. Маўляў, у свой час Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР не рэабілітаваў, а ўсяго амніставаў Ларысу Геніюш.

Хаця, як падкрэслівалі прамоўцы, Ларыса Геніюш зычыла незалежнасці роднай краіне не толькі ад гітлераўскай Германіі і панскай Польшчы, а і ад бальшавіцкага Савецкага Саюза.

Дарэчы, помнік палымянай зэльвянцы ў Старых Дарогах – другі твор Міхася Інькова. Першы варыянт яго знаходзіцца ў сядзібе Саюза пісьменнікаў у Мінску. Чакае сваёй устаноўкі ў Зэльве. Як вырашыцца лёс першага? Паводле слоў Анатоля Белага, Камітэт па ўвекавечванні памяці Ларысы Геніюш вырашыў наступнае. Калі ў хуткім часе беларускі ўрад не дазволіць устанавіць помнік у Зэльве, то яго ўстановяць у амерыканскім горадзе Клівлендзе. Менавіта яго беларуская дыяспара сабрала грошы на помнік.

- Такім чынам, можа стацца, што сам помнік зробіцца помнікам-эмігрантам, - усміхнуўся Анатоль Белы. І дадаў: - Эпоха манкуртаў не скончылася разам з XX-м стагоддзем...

Андрэй ЗАРЭЦКІ.

Трэці месяц доўжыцца супрацьстаянне на Курапатах. Улады хочуць пракласці кальцавую дарогу вакол Мінска праз месца знішчэння і масавага пахавання ахвяр сталінізму або небяспечна блізка ад яго. Грамадскасць імкнецца не дапусціць гэтага. Пра драматычнае яе змаганне дзяржаўныя газеты не пішуць нічога. Недзяржаўныя кароткія інфармацыі - даюць. Што, аднак, не дазваляе ўявіць агульны малюнак. Нашай газеце інтэрв'ю даў адзін з абаронцаў Курапатаў - Сяргей ВЫСОЦКІ.



НЕ ДАПУСЦІЦЬ ВАНДАЛІЗМУ!

- Што такое ўвогуле Курапаты? Гэта месца масавых забойстваў і пахавання мірных людзей, знішчаных сталінскім рэжымам. Па афіцыйных, прызнаных звестках, каля 200000 забітых людзей там ляжыць. Але неаднаразова, у тым ліку пры Лукашэнку, рабіліся спробы даказаць адваротнае – што там быццам бы забітыя ахвяры фашызму. Усе яны завяршыліся поўным правалам. Натуральна, што гэта месца сімвалізуе трагізм расійска-камуністычнага панавання на Беларусі.

Нездарма яно выклікае такую павышаную цікавасць. Агульнавядома, што ў адным Мінску шэсць месцаў масавых забойстваў. Але пра некаторыя з іх людзі чулі, большасць – не. І толькі адно месца, якое ведаюць усе – у Мінску, Беларусі і па-за яе межамі. Таму не выпадкова, што ў канцы 80-х гадоў менавіта з Курапатаў пачалося абуджэнне беларускай хвалі Адраджэння. Як не выпадкова сёлета менавіта ў гэтым месцы вырашана канчаткова раздавіць беларускі рух. Выбраны вельмі зручны момант – пасля выбараў, калі у грамадстве панавала агульная апатыя, сярод лепшых яго прадстаўнікоў вельмі шмат было разгубленасці. Гэта акалічнасць скарыстана, каб распачаць будаўніцтва кружной дарогі якраз праз урочышча Курапаты. Хаця прапаноўваўся і разглядаўся альтэрнатыўны варыянт: пашырыць паралельную трасу. МВФ прапаноўваў Аляксандру Рыгоравічу аплаціць дадатковыя выдаткі. Вельмі жыхары прасілі мясцовыя, навукоўцы. Але было прынята цвёрдае палітычнае рашэнне. Праектыроўшчыкі, будаўнікі, з якімі я размаўляў, хаваюць вочы долу і кажуць: нам загадалі весці трасу менавіта праз урочышча Курапаты.

Эканомія сродкаў? Па падліках, паўдня Славянскага базара каштавала столькі, колькі каштавала б правесці ўздоўж гэту ветку.

Створаны Камітэт "Мемарыял" не выявіў актыўнага пратэсту. Навукоўцы зрабілі выснову, што на бліжэйшых ад дарогі метрах пахаванняў няма, хаця грунтоўных даследаванняў не было.

Але выбухнуў сапраўдны пратэст з боку радыкальнай, ці нацыянальнай патрыятычнай апазіцыі, – перш за ўсё моладзі. Моладзь ўмяшалася ў гэты план. Яе не задаволіла бесчалавечная пазіцыя рэжыму. І не толькі моладзь не пагадзілася.

Прадстаўнікі незарэгістраваных Беларускай партыі свабоды і "Маладога Фронту" разбілі лагер тады, калі бульдозер ужо быў ледзь не ў сярэдзіне ўрочышча. Насуперак дамоўленасцям, якія заключаліся паміж навукоўцамі і прадстаўнікамі "Мемарыялу" з аднаго боку і рэжымам з другога.

Работы там удалося перарваць. Іх сталі весці ў межах абумоўленай трасы. Але потым аказалася, што будаўнікам патрэбны яшчэ два метры для камунікацый, два метры для вадасцёкаў... Быццам бы не ведалі, што, калі будуецца траса, то будуць камунікацыі, вадасцёкі, зоны бяспекі і г.д. Пра гэта трэба было своечасова інфармаваць грамадскасць, адкрыта. Магла быць зруйнавана вельмі вялікая частка святога месца. Але мы адваявалі 8 метраў, потым яшчэ два. Дастаткова шмат. Літаральна кожны дзень барацьба. Крок наперад – крок назад. Мы ставім крыжы, яны стараюцца іх адсоўваць. Мы зноў ставім іх. Фактычна за кожны крок з першага дня ідзе вельмі сур'ёзная барацьба. З пачатку былі сутычкі з рабочымі, якіх падбухторваў рэжым. Некаторыя ў падпітку былі супраць нас. З АМАПаўцамі былі дзве сутычкі. Пазіцыйная барацьба працягваецца. Але відавочна, што рэжым зробіць усё магчымае, каб знішчыць гэтае ўрочышча, і перашкаджае толькі кругласутачная прысутнасць там людзей: карэспандэнты з усяго свету, грамадскасць, людзі прыязджаюць з усёй Беларусі, ахвяры рэпрэсій.

- Колькі прыкладна крыжоў там ужо ўстаноўлена?

- Каля сотні. Можа – болей.

- Колькі часу цягнецца вось гэта валанцёрства ці як яно называецца?

- Яно пачалося праз тыдні два пасля выбараў.

- І там хлопцы, дзяўчаты кругласутачна знаходзяцца?

- Кругласутачна. Не толькі моладзь. Для нас гэта – найперш справа сумлення. Там пастаянна знаходзіцца аўтобус АМАПа. Нанач прыязджае нарад міліцыі. Час ад часу здараюцца правакацыі, сутычкі з нейкімі падпітымі хуліганамі. Хаця і міліцыя побач.

Але я хачу сказаць іншае. Тое, што зрабілі ў Курапатах. Перш за ўсё – прыпыненне паслявыбарнай апатыі, безнадзейнасці ў грамадстве, што не маглі зрабіць многія беларускія палітыкі. А фактычна адбылося ўратаванне сумлення нашай сённяшняй паднявольнай нацыі, якая здолее ўзняцца з каленяў. Фактычна мы загартоўваем дух перамогі, якая абавязкова прыйдзе да беларусаў. Тыя, хто ў гэты час знаходзяцца ў Курапатах або наведвае іх, праходзяць духоўнае ачышчэнне. Умацоўваецца дух супраціву. Нацыянальнага.

Уратаваны Курапаты на сённяшні час. З палітычнага гледзішча – нічыя на карысць Беларусі. Пакуль і гэта – добра. Бо Хатынь, напрыклад, з'яўляецца сімвалам генацыду, жорсткасці нацызму супраць чалавецтва. А Курапаты – сімвал камуністычнага генацыду супраць беларускага народа, народаў Усходняй Еўропы. І знішчыць яго пакуль не ўдалося.

- Трошкі падрабязней раскажыце, што адбываецца ў Курапатах, якія найбольш вострыя моманты былі. Ведаю, што нехта літаральна клаўся пад бульдозер. Цяпер зіма. Як вытрымліваюць абаронцы нацыянальнай святыні?

- Пачнем са стаўлення звычайных людзей, жыхароў раёна. У Курапатах вельмі часта збіраюцца людзі. У тым ліку сталага века. Паміж сабой гавораць: ой-ёй-ёй, што ж творыцца! Яны вельмі не здаволены тым, што траса будзе праходзіць каля іхняга дома, што знішчаюцца Курапаты. Нават самыя ачмураныя камуністычнымі забабонамі людзі ведаюць, што магілкі нельга чапаць. І падтрымліваюць абаронцаў Курапатаў. Бывае, прыносяць ежу. Але і страшэнна баяцца. Яны кажуць прама: мы баімся. Жывая памяць пра жудасны сталінскі рэжым, а сённяшні наш фактычна працягвае старую практыку. Той знішчаў людзей, а гэты знішчае памяць пра іх знішчэнне.

Кожны дзень прыходзяць дэлегацыі. Замежнікі. Амбасадары. Прыходзяць былыя пацярпелыя, якія засталіся жывыя. Выказваюць падтрымку. На гэта часам нельга глядзець спакойна. Калі прыходзіць чалавек, які адсядзеў 25 гадоў. Ледзь стаіць на нагах, плача. Такую сцэну не проста перанесці чалавеку нават з моцнай псіхікай.

Вельмі цікавае стаўленне прадстаўнікоў улады. Не вышэйшай, вядома. А ніжэйшай, выканаўчай. Рабочыя, амапаўцы кажуць: нас падставілі... Хаваюць вочы долу. За гэты час брыгада рабочых звольнілася. Па іх словах, не маглі спаць спакойна, гледзячы на ўсё, што адбываецца. Яны зразумелі, што апынуліся на баку зла ў супрацьстаянні з дабром.

Таксама думалі людзі і ў сталінскія часы. А машына зла працавала і знішчалася ўсё святое. І што б ні думалі, рэальна гэту машыну можа спыніць толькі воля і сіла. Сіла гэта, натуральна, схавана ў народзе, але часам яе павінна ў сабе канцэнтраваць нейкая абмежаваная частка людзей. Што, дарэчы, адбываецца на Курапатах.

І яшчэ скажу, што там пастаянна працягваюцца акты вандалізму. Была пастаўлена мемарыяльная пліта ад амерыканскага народу. Яе разбілі. Невядома хто. Дагэтуль не могуць знайсці вінаватых. Туды прыходзяць агрэсіўна настроеныя маладыя людзі. Але атрымоўваюць адпор. Гвалт учыняць яны не могуць, бо працягваецца вахта.

Быт. Адпачынак ёсць, абед. Жывуць па распарадку дня. Астатні час людзі працуюць, рыхтуюць дровы для таго, каб вытрымаць гэтыя халады. Рыхтуюцца таксама крыжы, ямкі для іх.

Перамовы з АМАПаўцамі і з будаўнікамі. Таму што побач існуем. У палатцы трываць можна. Хаця і адны суткі на марозе пратрымацца не проста. Шмат увагі трэба аддаваць наведвальнікам Курапатаў – расказаць, растлумачыць усё. Кожную нядзелю святар Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царквы праводзіць малебны, якія збіраюць шмат народу.

- Колькі прыблізна там знаходзіцца людзей?

- Адну ноч начуе 6 чалавек, другую – 14. Па-рознаму. Прадстаўнікі БПС, "Маладога Фронту", "зубраняты" і іншыя. Адзін маладафронтавец, Цімур, клаўся пад бульдозер, каб не даць засыпаць крыж. Павел Севярынец актыўна сябе паводзіць.

- У газетах з'яўляліся здымкі: бульдозеры насоўваюцца на крыжы. Ці паваліпі якія-небудзь? Як гэта адбывалася? Як вялі сябе вашы ў гэты момант? Рабочыя?

- Розныя былі сітуацыі. Адзін п'яны на бульдозеры ганяўся за жанчынамі, што ішлі на Курапаты. Давялося нашаму хлопцу "павучыць" яго. На "мове", якую той разумее. Было, нашы не давалі аднаму крыж паваліць. Умяшаліся АМАПаўцы... Увогуле ж руйнаваць хрысціянскія крыжы не адважваюцца. Мы даводзім, як ва ўсе часы ганебна заканчвалі жыццё тыя, хто знішчаў хрысціянскія святыні, храмы. Не да іх саміх, дык да нашчадкаў кара прыходзіла. А здаралася апошнім часам і так, што асобныя АМАПаўцы дапамагалі ставіць крыжы.

Увогуле ж улады паважаюць толькі сілу. І цяпер яны калі і не адступілі, то разгубіліся, наткнуўшыся на сілу і волю нават невялікай колькасці людзей, якія не збіраюцца адступаць. Хаця рэжым і спадзяецца, што абаронцаў Курапат прагоняць маразы. Дарэмна!

Гутарыў В. МУРЫЛЁЎ.

Криминал

Диагноз по Зощенко

Еще в 1925 году известный писатель-сатирик М.М. Зощенко повествовал о любителях затеять конфликт из-за пустяка, из-за неумения ладить друг с другом. Писал, в частности, о драке на кухне в коммунальной квартире, в которой пенсионер-инвалид, «заботливо» огретый кастрюлькой по лысой голове, лежал в крови, «скучный такой».

Мудрый, однако, М. М. Зощенко, дальновидный какой! Подметил в наших людях неизлечимый диагноз (по-другому это не назовешь) - нервность излишнюю. По-прежнему бурные сцены между супругами, соседями. Такие, что приходится взывать к помощи милиционеров, затем искать защиты в судах. Все так же участковым инспекторам впору на бегу кричать конфликтующим знаменитое зощенковское: «Запасайтесь, дьяволы, гробами, сейчас стрелять буду!» Смешно? Было бы... Если б не было так грустно.

Порою кажется, что Зощенко творил не в 1925 году, а уже в нашем 2001-м: «Народ очень уж нервный. Расстраивается по пустякам. Горячится. И через это дерется грубо, как в тумане».

А из-за чего нервничаем-то, господа-товарищи?

Сорокалетний Сергей Петрович августовским утром на веранде своего дома в д. Жабин Солигорского района в ответ на предложение жены убрать лук с огорода схватил ее за волосы и благоверной расстроил здоровье на 4 месяца. Обвинил во всем... своего отца и жену. Нервы, мол, из-за них расшатаны. Все им что-то нужно. Вот супругу и «успокоил» по-джентльменски на определенное время. А врачам и суду - забот прибавил. Кто уж потом лук убирал - выяснить не удалось. Но, вроде, на огороде не зазимовал.

Пьяный двадцатипятилетний отпрыск в Солигорске избил мать, «наградив» ее кровоподтеками и переломом челюсти. Может, господи прости, лучше бы такой маленьким помер. А так вырос, сильным, деловым стал. Ему, видите ли, в три часа ночи понадобился номер телефона какого-то московского родственника. Мать же имела неосторожность ответить, что этот номер есть в записной книжке сына. Сынуля, что называется, «сел на коня», «разобрался» со строптивой матерью.

Тридцативосьмилетний Николай в восемь вечера, приняв на душу, затеял конфликт с односельчанином Григорием. Слово за слово - нервно высказывался по «наболевшим» проблемам. Услышав, что Григорий не желает с ним затевать спор и советует пьяному идти домой, Николай от брани перешел к битве. Успокоился лишь когда сломал несчастному челюсть, несколько ребер, поранил лицо, грудь. Лечение ран заняло около 4 месяцев. Лечился Григорий. «Нервенную» болезнь Николая рекомендовано лечить в милиции и суде.

Но особенно нервишки шалят у представительниц слабого, прекрасного пола. Две пожилые женщины подрались на улице города. Причем, Марья Петровна, вызывая на разговор Ольгу Петровну, лупила ногой в дверь ее квартиры, чем озадачила многих соседей. Выбежала на улицу, стала бросать палкой в окно, пытаясь его разбить. Нервы у Ольги Петровны не выдержали. Видать, стекла было жалко. Вышла на улицу: говори, мол, чего надо. И тут Марья Петровна как-то хищно на нее напала: била палкой, рвала волосы, кусала! За пострадавшую вступились соседи. Жертва не замедлила ретироваться. Наверняка она не вышла бы из дома, знай, что стеклу все равно суждено быть разбитым. Наконец-то услышав долгожданный звон стекла, виновница конфликта бросила палку и с чувством глубокого удовлетворения удалилась ... чтобы позже «засветиться» в милиции. Вот это ураган страстей! А представьте, если бы Ольга Петровна жила двумя-тремя этажами выше, как долго забрасывала бы в окно палку Марья Петровна? Может быть, попросила бы лестницу у пожарников? По всему видно, весьма деятельная гражданочка. Все сметет на своем пути. К таким на разговор нужно выходить с копьем, не иначе. Как на мамонтов.

Николай Ж. в д. Горка, вечером, будучи навеселе, решил «повеселить» и жену. Нанес ей десять ударов шваброй, а заодно и многочисленные ссадины на лице, на спине, конечностях. Чего так разнервничался благоверный? То ли болезнь нервная, то ли жена его не поняла, не хотела веселиться. Но долг платежом красен - она его «повеселила». Правда, не дома, не шваброй, а своим заявлением в отделение милиции. И, как говорят в народе, снятием побоев.

В милиции, оказывается, тоже люди нервные, сразу давай на нервно-психованных протоколы составлять и дела в суд направлять. И судьи - люди тоже нервные, так как штрафы присуждают. Если не похуже что. И будут правы, если скажут, как при жизни великого писателя: «Вы - не советские люди, а обломки рухнувшей империи». И так же по-зощенковски «не дозволят справлять свой дебош на развалинах прежней жизни».

Так что, люди добрые и очень нервные, помните слова великого сатирика, что «нервы нервами, а драться не следует».

Н. ГОЛУБИНА.

На вершине славы и успеха

Кумиры

В список 50 наиболее влиятельных женщин в шоу-бизнесе, который ежегодно публикует на своих страницах издание «Hollywood Reporter», вошли имена Джулии Робертс и Мадонны. Актриса завоевала 3-е место, поп-королева - 42-е. Представители издания считают, что обе они являются достаточно влиятельными фигурами не только на сцене, но и вне ее.

Мадонна не в первый раз значится в «Hollywood Reporter Power List», в 1998 году певица занимала в списке 28-е место. «Мадонна вновь попала в этот список благодаря силе своей личности и туру «Drowned World» этого года, - сообщил редактор журнала. - И это еще не все: певица возглавляет свою собственную компанию и звукозаписывающий лейбл».

По материалам InterMedia.



Julia Roberts

Поздравляем!

Наталье Анатольевне ПЕТРОВСКОЙ,
работнице производственного объединения «Полимир» г. Новополоцка

Уважаемая Наталья Анатольевна! Поздравляем Вас с юбилеем!

Пусть дольше жизнь идет спокойно,
Не зная горестей и бед,
И крепким будет пусть здоровье
На много, много, много лет!

Исполнительное бюро Независимого профсоюза работников ПО «Полимир».

Галине Адамовне КАПЦЕВИЧ,
работнице Центральной лаборатории РУП «ПО «Беларуськалий»

Уважаемая Галина Адамовна! Поздравляем Вас с юбилеем!

Пусть эта знаменательная дата
В душе оставит добрый след!
Желаем Вам всего, чем жизнь богата:
Здоровья, счастья, мира, долгих лет!

Исполнительное бюро Независимого профсоюза горняков ЦЛ.

Уважаемые
Светлана Геннадьевна ТРУХАН
и
Валентина Николаевна ТКАЧЕНЯ!

Поздравляем вас с днем рождения!

Пусть этот день прекрасным будет
И все сбываются мечты!
Пусть солнце светит вам повсюду
И улыбаются цветы!

Исполнительное бюро Независимого профсоюза горняков Центральной лаборатории РУП «ПО «Беларуськалий».

Николаю Николаевичу НОВАЦКОМУ,
работнику Первого рудника РУП «ПО «Беларуськалий»

Уважаемый Николай Николаевич! Поздравляем Вас с 40-летием!

Желаем счастья, радости, тревог,
Желаем солнца, света и улыбок!
Пусть много будет пройдено дорог,
Пусть мало будет сделано ошибок!

Исполнительные бюро Независимого профсоюза горняков Первого рудника и РУП «ПО «Беларуськалий».

Василию Васильевичу ХОВАНСКОМУ,
работнику Первого рудника РУП «ПО «Беларуськалий»

Уважаемый Василий Васильевич! Поздравляем Вас с 45-летием!

Разрешите пожелать Вам
Счастья, мира и тепла!
Пусть сопутствует удача,
Чувство юмора всегда!

Исполнительные бюро Независимого профсоюза горняков Первого рудника и РУП «ПО «Беларуськалий».

Таинственный мир гадания

(Продолжение. Начало в № 38)

3. КОЛЬЦО В ВОДЕ

Надо взять обыкновенный стакан с совершенно ровным дном, без всяких рисунков, налить в него три четверти воды и осторожно опустить на середину круглое обручальное кольцо, предварительно вычищенное, потом надо сравнительно продолжительное время смотреть через воду в середину опущенного кольца. При довольно богатой фантазии, многие уверяют, что видят лицо будущего жениха.

4. ПОДСЛУШИВАНИЕ

Ходят слушать к запертой церкви к ее дверям или к часовне, выбирая для этого ясную лунную ночь. Слушающие обязательно должны быть девушки. По поверию, будто бы можно услышать или венчальное пение или заупокойную - кому суждено в этом году выйти замуж или умереть.

5. БРОСАНИЕ БАШМАЧКА

Гадающие девушки обыкновенно выходят за околицу деревни и бросают впереди себя башмаки (с левой ноги). И уже по тому, куда указывает носок башмака, можно судить о том, с какой стороны будет суженый. Если же носок башмака указывает на околицу, то это обозначает, что гадающая в этом году замуж не выйдет.

6. ГАДАНИЕ С ЗЕРКАЛОМ

Это гадание считается одним из самых страшных. Гадающая должна быть обязательно одна. Для этой цели к 12-ти часам ночи она запирается в бане. Раздетая, она садится за стол против зеркала, по бокам которого в подсвечниках горят две свечи. Против этого зеркала устанавливается другое зеркало и таким образом образуется целая галерея взаимных отражений зеркал. Надо внимательно наблюдать и сосредоточить все напряжение воли именно в этой галерее, в которой, говорят, показывается будущий суженый.

Omen.ru.

(Продолжение следует).

Гурманам на заметку



КУРИЦА ПО-АРАБСКИ

Отварить курицу, разрезать и сложить в кастрюлю. Сверху залить лимонным соком, засыпать мелко нарезанным чесноком и поместить под гнет на 3-4 часа.

Затем взбить 4 яйца, добавить муки, в полученную смесь окунуть кусочки курицы. Выложить на сковородку с разогретым маслом. Туда же добавить зеленый горошек. Все это залить остатками взбитых яиц и поместить в горячую духовку минут на 15. По вкусу можно сверху добавить сыр, майонез, сметану.

Приятного аппетита!

Просто анекдот

- Если бы вы знали, как моя теща любит поговорить! Когда она была на курорте, у нее загорел даже язык!

☺ ☺ ☹

Жена говорит мужу:
- Что-то ты не уделяешь внимания теще, даже никуда не сводишь?
- А что толку, все равно она обратно дорогу найдет.

☺ ☺ ☹

Лежит зять на кровати и ничего не делает, а тёща ему и говорит:
- Сынок! Посмотри, потолок обваливается, крыша прохудилась! Надо что-то делать с жильем!
А зять её в ответ:
- Оно моё? Оно мне надо?
Пошла тёща и переоформила дом на зятя, надеясь, что он начнёт что-то делать. Приходит и говорит:
- Сынок! Теперь дом твой! Может, начнёшь ремонт?
А зять отвечает:
- Оно твоё? Оно тебе надо?

☺ ☺ ☹

Человек тонет в море, кричит, вокруг никого, только на берегу сидит загашенный в дупель наркоман и улыбается.
- Помогите, спасите, тону!
- Все нормально, мужик, все нормально!
Человек уходит под воду, еле выныривает и орет:
- Помогите!
- Все хорошо, мужик, спокойно.
Человек уходит под воду совсем и тут подъезжает спасательный катер. Видят – сидит наркоман. Подплывают к нему и спрашивают:
- Кто кричал, кто тонет?
- Да нет никого, все нормально.
Спасатели уплывают.
Из-под воды из последних сил выныривает человек и кричит:
- Помогите!
- Не бойсь, мужик, купайся, я тебя отмазал!!!

Тест: Есть ли у вас невроз?

Интенсивность современной жизни настолько напряженная, что большинство из нас не успевает адаптироваться к новым условиям. Именно поэтому те или другие невротические проявления наблюдаются у 70-90 процентов населения. А нарушения в работе нервной системы часто являются причиной заболевания внутренних органов. Однако, занятые неотложными делами, многие из нас не находят времени, чтобы прислушаться к своему организму. Возможно, к этому подтолкнет тест, который мы предлагаем.

В приведенном ниже списке отметьте состояние и мысли, которые часто (не менее, чем два раза в неделю) в последнее время наблюдали за собой: раздражительность - 2; поверхностный сон - 1; тяжелое засыпание - 2; раннее пробуждение - 2; плохое настроение - 2; безразличие ко всему - 3; головная боль - 2; головокружение - 2; общая слабость - 2; повышенная утомляемость - 2; плаксивость - 3; боль в сердце - 2; усиленное сердцебиение - 2; неприятные сны - 2; внутреннее напряжение - 3; плохой аппетит - 2; ожидание чего-то плохого - 3; страх одиночества - 3; боязнь темноты - 2; боязнь езды в транспорте - 3; боязнь смерти - 3; безразличие к жизни родных - 5; нежелание жить - 5; притупленность чувств - 3; мир в серых тонах - 5; трудность сконцентрироваться - 3; снижение сексуального желания - 4; навязчивые мысли - 4; внутреннее раздвоение - 5; отчужденность от всех родных - 4.

Сложите баллы. **Если вы набрали до 15 баллов**, то у вас невроз легкой степени, не исключено, что вы отвечали на вопросы недостаточно внимательно или слишком хорошо думаете о своем здоровье. Если эти два момента исключены, то у вас еще есть резервы. Но если вы будете продолжать такой уклад жизни, то они начнут быстро уменьшаться. Необходимо обратить внимание на организацию вашего труда и отдыха. На пользу пойдут ежедневные прогулки по 20-30 минут, успокоительный настой после еды.

Од 16 до 30 баллов - невроз средней степени. Вы уже давно не занимались своим здоровьем. Скорее всего, ваши силы неэкономно используются на сверхдобросовестном выполнении своих обязанностей на работе и дома. Вам необходим ежедневный отдых в течение нескольких часов с получением максимального количества положительных эмоций. Критически оцените свои взгляды относительно себя и своего места в жизни: возможно, вы берете на себя очень много из-за недоверия к другим или неуверенности в себе. Скорее всего вам поможет медикаментозное общеукрепляющее и успокаивающее лечение. Но пусть это решит ваш врач.

От 31 до 50 баллов: у вас невроз тяжелой степени. Вы на грани психического срыва. Если стрессовые ситуации создаются, в основном, на работе, то лучше на два-три дня взять отдых. Нужно подумать об изменениях в семье и на работе. Вам необходимо лечение, которое могут провести врач-психиатр и психотерапевт. Лучше его не откладывать, чтобы не стать их пожизненным пациентом.

От 51 балла и более. У вас предпсихопатическое состояние. Лечение только стационарное и только у психиатра.

КУРСЫ ВАЛЮТ

На 12.12.01	Нацбанк	Банки Минска	«Черный рынок»
Доллар США	1558	1570 – 1583	1560 – 1575
Марка ФРГ	710,6	705 – 711	–
Рубль России	51,79	51,8 – 52,4	–

Источник: www. tut.by

Салідарнасць
Рэгістрацыйны № 418 ад 19.06.2001 года
Газета заснавана ў 1991г. Іванам Юргевічам

Заснавальнік — Беларускі Незалежны прафсаюз гарнякоў, хімікаў, нафтаперапрацоўшчыкаў, энергетыкаў, транспартнікаў, будаўнікоў і іншых работнікаў

Наш падпісны індэкс - 64072

Рэдакцыйная калегія:
Бабаед В.С., Юргевіч І.В., Галубіна Н.Я., Грынцэвіч С.М., Абрамычаў Д.Я.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за дакладнасць прыводзімых фактаў, цытат і іншай інфармацыі. Рэдкалегія можа друкаваць матэрыялы, не абавязкова падзяляючы пункт гледжання аўтара.

Галоўны рэдактар Віталь МУРЫЛЁЎ
Адрас рэдакцыі: 223710,г.Салігорск,вул.Леніна, 42, БНП. Тэл.: (01710) 2-06-22, тэл./факс: (01710) 2-00-59
E-mail: sol_sn@inbox.ru
Падпісана ў друк 13.12.2001 года ў 8.00
Газета аддрукавана ў друкарні г.Слуцка, 223610 г.Слуцк, вул. Багдановіча, 7
Заказ 4371
Тыраж 7.000